В.Э. Зіманскі (Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)

КРЫНІЦЫ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫЧНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

Ключавыя словы: тэрмін, запазычанне, этымалогія, тэматычная група, семантыка, музыка, музычнае мастацтва.

Музыка – мастацтва, якое адлюстроўвае рэчаіснасць у гукавых вобразах. Яна здольная глыбока ўплываць на эмацыянальны настрой чалавека, таму здаўна выкарыстоўваецца ў грамадска-выхаваўчых і арганізуючых мэтах, адначасова служачы задавальненню эстэтычных патрэб грамадства. Каштоўнасць музычнага твора вызначаецца прагрэсіўнасцю ідэйнага зместу і мастацкай дасканаласцю яго вобразнага ўвасаблення. Таму пры фарміраванні ўсебакова развітай, нацыянальна арыентаванай асобы на ўсіх этапах навучання, ад школьнага на вузаўскага, побач з авалоданнем навуковымі фактамі ў цэлым і звязанымі з развіццём культуры краіны – у прыватнасці, варта значную ўвагу ўдзяляць засваенню інфармацыі, звязанай з асаблівасцямі і заканамернасцямі ўзнікнення пэўнай тэрміналагічнай сістэмы. Гэта дазволіць новым пакаленням спазнаць сувязь мінулага з сучасным, бачыць узаемадзеянне і ўзаемаўплыў далёкага і блізкага, “чужога” і “свайго”, што бачыцца асабліва актуальнай задачай у сучасны перыяд. Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца выяўленне крыніц фарміравання беларускай музычнай тэрміналогіі. Матэрыялам даследавання паслужылі даныя лексікаграфічных крыніц: [1; 4] і інш.

Музычная тэрміналогія з’яўляецца неад’емнай часткай тэрміналагічнай сістэмы кожнай нацыянальнай мовы. Беларускае музычнае мастацтва мае глыбокія вытокі і даўнія традыцыі, у выніку чаго сучасная беларуская музычная тэрмінасістэма налічвае амаль тры тысячы лексічных адзінак, якія называюць музычныя інструменты, пеўчыя галасы, харавую, інструментальную, вакальна-сімфанічную музыку, яе жанры, стылі, формы, напрамкі, назвы музычных устаноў, будынкаў, выканаўцаў, асаблівасці выканання і г.д. Узнікшы ў XI–XII стст., музычнае мастацтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі к XV–XVI стст. дасягнула свайго росквіту. У XVII ст. тут існавалі не толькі драматычныя, але і оперныя тэатры, напрыклад, Нясвіжскі і Слуцкі тэатры Радзівілаў, Свіслацкі тэатр Тышкевіча і інш. Іх дзейнасць выклікала неабходнасць пераасэнсавання агульнаўжывальных слоў у асяроддзі выканаўцаў музычных твораў. Статус тэрмінаў паступова замацоўваўся за агульнавядомымі словамі (т.зв. тэрміналагізацыя): *труба* ‘медны духавы музычны інструмент, самы высокі па гучанні сярод медных духавых’, *выканаўца* ‘той, хто выступае з выкананнем мастацкага твора’, *чвэрць* ‘мера музычнага часу, ¼ частка цэлай ноты’; *голас, гук, ключ, скрыпка, дуда, свірэль, смык, выкананне* і пад. У пазнейшы час актыўна праходзіў працэс кампазітнага тэрмінаўтварэння: *голасавядзенне* ‘рух кожнага асобнага голасу’, *гукарад* ‘паслядоўнасць гукаў, размешчаных па

вышыні’, *мілагучнасць* ‘прыемная ўзгодненасць гукаў’, *трохгучча* ‘акорд з трох гукаў’; *шматгалоссе* і інш., у тым ліку тэрмінаў-словазлучэнняў: *скрыпічны ключ* ‘спецыяльны значок, які ставіцца ў пачатку нотнай лінейкі і паказвае на тое, што нота першай актавы "соль" знаходзіцца на другой лініі нотнага стана’; *голас пеўчы, масавая песня, жаночы хор* і г.д. У выніку быў створаны ўласнабеларускі пласт беларускіх музычных тэрмінаў.

Як вядома, ні адна мова свету не можа абысціся без тэрміналагічных запазычанняў з іншых моў, асабліва з моў тых народаў, што мелі ў якой-небудзь галіне надзвычайныя поспехі. Хоць шмат інтэрнацыянальных тэрмінаў неславянскага паходжання ўвайшло ў беларускую мову праз рускую, мэтазгодна непасрэдна вызначыць мову-крыніцу, якая значна паўплывала на замацаванне тэрміна ў беларускім і сусветным музычным тэрміназнаўстве. Першаступеннае значэнне тут трэба аддаць лацінскай і грэчаскай мовам, што звязана з багатай гісторыяй культурнага развіцця старажытных рымлян і грэкаў.

Значную частку тэрміналогіі розных відаў мастацтва, у тым ліку і музычнага, склалі запазычанні з лацінскай мовы. Пераважна гэта тэрміны, якія абазначаюць назвы спосабаў выканання: *ад лібітум* ‘па жаданні’, *віва* ‘бадзёра’, *далароза* ‘з сумам’; тыпаў і частак музычных твораў: *прэлюдыя* ‘ўступ перад творам’, *варыяцыі* ‘твор, які выкананы з рознымі ўскладненнямі’; музычных інструментаў: *флейта* ‘білабіяльны музычны інструмент’, *віёла* ‘струнны смычковы музычны інструмент’; тэрміны з тэорыі музыкі: *вакал* ‘выкананне музыкі голасам: сольнае, ансамблевае, харавое’, *дуоль* ‘дзве ноты, што маюць працягласць трох нот таго ж віду’, *актава*, *араторыя, транспазіцыя, тэрцыя, эквісон*; тэрмін *нота* ‘ўмоўны графічны знак для запісу гукаў, служыць для музычнага запісу на нотным стане’ і назвы нот (*до, рэ, мі, фа, соль, ля, сі*) шасціступенчатай актавы.

У беларускай музычнай тэрміналогіі шырока выкарыстоўваюцца запазычанні з грэчаскай мовы: назвы музычных калектываў: *аркестр*, *хор,* назвы музычных твораў: *сімфонія* ‘вялікі музычны твор для аркестра, звычайна з 3–4 частак, якія адрозніваюцца адна ад другой характарам музыкі і тэмпам’, *гімн*; назвы музычных устаноў: *філармонія* ‘ўстанова, якое займаецца арганізацыяй канцэртаў і прапагандай музычнага мастацтва’; тэрміны з тэорыі музыкі: *гама* ‘паслядоўны рад музыкальных гукаў, які павышаецца або паніжаецца ў межах адной ці некалькіх актаў’, *гамафанія* ‘склад шматгалосся, уласцівы кампазітарскай музыцы Еўропы ў XVII–XIX стст.’, *гексахорд* ‘шасціступенчаты гукарад у дыяпазоне сексты’, *дыез* ‘значок, які абазначае павышэнне гуку на паўтон’, *мелодыя* ‘заканамерная гарманічная паслядоўнасць гукаў, якая ўтварае пэўнае музычнае адзінства’, *гармонія* і інш. Такім чынам, лацінская і грэчаская мовы – адна з найстаражытных крыніц, за кошт якіх фарміраваўся беларускі музычны слоўнік. Зараз за кошт запазычанняў з лацінскай і грэчаскай моў падтрымліваецца стабільнасць лексічных значэнняў музычных тэрмінаў, іх вялікія словаўтваральныя магчымасці шырока

выкарыстоўваюцца для ўтварэння тэрмінаў-неалагізмаў, а некаторыя музычныя тэрміны лацінскага і грэчаскага паходжання набылі статус міжгаліновых: *анатацыя, дыкцыя, экспромт, муза* і інш.

Асноўную групу ў беларускай музычнай тэрміналогіі складаюць запазычанні з італьянскай мовы, якія ўтвараюць найбольш тэматычна разнастайную групу лексем: назвы музычных твораў па характары музыкі і тыпе выканання: *імправізацыя* ‘спантаннае стварэнне музыкі’, *опера* ‘музычна-драматычны твор, у якім выканаўцы спяваюць у суправаджэнні аркестра’, *кантата* ‘буйны музычны твор урачыстага або лірыка-эпічнага зместу для канцэртнага выканання аркестрам, салістамі ці хорам’, *саната* ‘інструментальны твор складанай формы з некалькіх частак’, *канцэрт* ‘публічнае выступленне артыста па праграме’; назвы музычных тэмпаў, тэмбраў, рытмаў і стыляў: *адажыа* ‘павольна’, *алегрэта* ‘жвава’, *скерца* ‘жартаўліва’, *апасіната* ‘з запалам’, *кантабіле* ‘пявуча’, *дольчэ* ‘далікатна, пяшчотна’, *маэстоза* ‘ўрачыста, узвышана’, *кон дальчэрэца* ‘з пяшчотай’, *кон фуока* ‘з агеньчыкам’, *састэнута* ‘стрымана, дакладна, засяроджана’; назвы тэмбраў і тыпаў галасоў: *бас* ‘нізкі мужчынскі голас’, *барытон* ‘сярэдні мужчынскі голас’, *тэнар* ‘высокі мужчынскі голас’, *кантральта* ‘самы нізкі жаночы голас’, *сапрана* ‘высокі жаночы голас’; назвы музычных інструментаў: *віяланчэль* ‘струнны смычковы інструмент, сярэдні паміж альтам і кантрабасам’, *камертон* ‘прылада для фіксацыі і прайгравання эталоннай вышыні гуку’, *піянола* ‘1. пнеўма-механічны інструмент для ігры на піяніна без піяніста. 2. раяль, піяніна з такім інструментам’, *фортэпіяна* ‘струнны ўдарна-клавішны музычны інструмент’, *лютня*; назвы музычных калектываў, удзельнікаў музычных калектываў і асобных выканаўцаў: *капела* ‘група музыкантаў’, *квартэт* ‘ансамбль з чатырох выканаўцаў (спевакоў або музыкантаў) або музычны твор для чатырох інструментаў, галасоў’, *піяніст* ‘музыкант, які іграе на фартэпіяна’, *трыа* ‘музычны ансамбль з трох музыкантаў’, *саліст* ‘спявак, музыкант або танцор, які выконвае сольную партыю’; тэрміны з тэорыі музыкі і пабудовы музычных твораў: *арпеджыа* ‘акорд, у якім тоны бяруцца не адначасова, а паслядоўна’, *паўза* ‘прыпынак, спыненне’ *партытура* ‘нотны запіс, асобны для кожнага ўдзельніка выканання твора, з улікам сумяшчальнасці галасоў і інструментаў’, *мардэнт* ‘від меладычнага ўпрыгожання, чаргаванне асноўнага гуку і дадатковага’, *музычнасць* ‘уласцівасць і якасць музычнага’, *музыказнаўства* ‘навука, якая вывучае тэорыю і гісторыю музыкі’, *сальфеджыа* ‘1. вакальнае практыкаванне – спяванне нот з вымаўленнем іх назваў. 2. вучэбная дысцыпліна, прызначаная для развіцця музыкальнага слыху і голасу’, *трыёль* ‘трохдольная рытмічная музычная фігура ў музыцы двухдольнага памеру’, *тэмп* ‘мера часу ў музыцы; бывае: хуткі, павольны, спакойны’; назвы музычных твораў: *арыя* ‘вакальны твор, частка оперы; выконваецца адным спеваком у суправаджэнні аркестра’, *аперэта*; назвы, звязаныя з тэхнікай выканання: *а капэла* ‘спяванне без інструментальнага

суправаджэння’, *андантэ* ‘не спяшаючыся’, *альтэрата* ‘змяніць, змяненне’, *ачэляранда* ‘павялічваючы тэмп, паскараючыся’, *вівачэ* ‘жыва’, *глісанда* ‘слізгаючы’, *дакапа* ‘з пачатку’, *кон форца* ‘з сілай’, *крэшчэнда* ‘ўзмацняючы’, *леджыера* ‘лёгка’, *лента* ‘павольна, працяжна’, *мадэрата* ‘ўмерана’, *мецца вочэ* ‘напаўголасу’, *піцыката* ‘шчыпком, адрывіста’, *піяна* ‘ціха’, *піянісіма* ‘вельмі ціха’, *рытэнута* ‘запавольваючы’, *прэста* ‘хутка’, *семпра* ‘пастаянна, без змяненняў’, *стаката* ‘адрывіста’ *туці* ‘ўсе разам’ *фортэ* ‘гучна’ *фартысіма* ‘вельмі гучна’, *унісон* ‘адначасовае гучанне двух або некалькіх гукаў аднолькавай вышыні’; назвы нотных знакаў і запісаў: *басовы ключ* ‘значок, які пацвярджае знаходжанне ноты "фа" малой актавы на чацвёртай лініі нотнага стана’ і інш.

Запазычанні з французскай мовы не такія шматлікія; яны пранікаюць у беларускую мову пераважна праз рускую пачынаючы з XVI ст., найбольш актыўна – у XVIII–XIX стст. у сувязі з так званай “галаманіяй”, калі перайманне ўсяго французскага захапіла рускае дваранства і беларускую шляхту: *акампанемент, нюанс, куплет, раяль, эстрада* і інш. Галіцызмы характарызуюцца тэматычнай разнастайнасцю: назвы ўдзельнікаў музычных калектываў: *дырыжор* ‘кіраўнік калектыву выканаўцаў у аркестры, хоры, спектаклі’; назвы нотных знакаў: *бекар* ‘значок, які абазначае адмену дзеяння знакаў "бемоль" і "дыез"’, *бемоль* ‘значок, які абазначае паніжэнне гуку на паўтон’, *рэпрыза* ‘значок, які абазначае паўтор якой-небудзь часткі твора’; назвы тыпаў і тэмбраў галасоў і музыкі: *альт* ‘нізкі дзіцячы або жаночы голас’, *мажор* ‘музычны лад, акорд якога складаецца з вялікай і малой тэрцыі і мае радасную, бадзёрую гукавую афарбоўку’; назвы музычных твораў і іх частак: *марш* ‘жанр музыкі; музычная п’еса з выразным, энергічным рытмам’, *раманс* ‘твор для вакальнага выканання з суправаджэннем’, *уверцюра* ‘ўступ да твора’; тэрміны з тэорыі музыкі: *акорд* ‘гарманічнае спалучэнне некалькіх музычных гукаў’, *дыяпазон* ‘інтэрвал гукаў ад найніжэйшага да найвышэйшага, даступны музычнаму інструменту або чалавеку’, *музычны жанр* ‘род музыкі, музычных твораў, які характарызуецца пэўнымі сюжэтнымі, кампазіцыйнымі прыкметамі, а таксама асобныя разнавіднасці гэтага роду (танец, песня, марш, балет)’, *фактура* ‘спосаб афармлення шматгалосай музычнай кампазіцыі ў адным з музычных складаў’.

Англіцызмы ў музычнай тэрміналогіі ў асноўным адносяцца да XX ст.: *андэграўнд (андэрграўнд)* ‘шэраг мастацкіх кірункаў у сучасным мастацтве, якія супрацьпастаўлялі сябе масавай культуры’; *блэк-метал* ‘музычны напрамак, які характарызуецца змрочным, часам цягучым гучаннем’; *блюз* ‘1. песня або танец амерыканскіх неграў, якія выконваюцца ў павольным тэмпе. 2. форма джазавай музыкі ў рытме і манеры выканання гэтай песні’; *джаз* ‘1. від прафесійнай, пераважна танцавальнай музыкі з характэрнай для яе імправізацыйнасцю, што зарадзіўся ў ЗША XIX–XX стст. 2. аркестр з духавых, ударных і шумавых інструментаў для выканання такой музыкі’; *мюзікл* ‘1. музыкальна-

сцэнічны твор, пераважна камедыйнага характару, пабудаваны на выкарыстанні элементаў аперэты, балета, оперы і эстрады. 2. кінафільм такога характару'; *рэгтайм* '1. танцавальная музыка амерыканскіх неграў, папярэднік джазу. 2. амерыканскі бальны танец' і інш. Тэрміны англійскага паходжання характарызуюцца семантычнай разнастайнасцю і ў колькасных адносінах падзяляюцца на дзве падгрупы. Да першай належаць лексічныя адзінкі, што абазначаюць назвы танцаў (народных, бальных, сучасных) і віды танцавальнай музыкі: *бастон*, *блюз*, *джаз*, *бібоп*, *джаз-рок*, *джыга*, *кантрыданс*, *кейкуок*, *мэдісан*, *рэг-тайм*, *халігалі*, *чарльстон*, *шымі* і інш. Другая падгрупа – назвы музычных інструментаў і тэхнікі: *банджа*, *вірджынел*, *плэер*; назвы музычных твораў, нумароў: *кліп*, *мюзікл*, *сонг*; назвы ансамбляў, вакальна-інструментальных груп: *Бітлз*, *дыксіленд*; назвы збудаванняў: *мюзік-хол*.

Музычныя тэрміны - германізмы колькасна нязначныя; у асноўным гэта запазычанні XVIII ст. (праз рускую мову): *хормайстар* 'кіраўнік хору', *канцэртмайстар* 'піяніст-акампаніятар, які развучвае партыі са спевакамі', *аншлаг, канкан, матыў, туш, арфа*.

Такім чынам, асноўнай крыніцай сучаснай беларускай музычнай тэрміналогіі выступаюць італьянская і французская мовы. Раманізмы і галіцызмы ахопліваюць амаль усе тэматычныя групы музычнай тэрміналогіі і з'яўляюцца дэрывацыйна ўстойлівай групай слоў. На іх фоне германізмы, нягледзячы на даўнія і трывалыя музычныя традыцыі нямецкага і аўстрыйскага народаў, прадстаўлены менш шырока. Лацінізмы і грэцызмы ў беларускай музычнай тэрміналогіі займаюць прамежкавае становішча, уваходзячы ў класічныя для музычнага мастацтва тэматычныя групы лексікі.

Абсалютная большасць запазычанняў з'яўляецца інтэрнацыянальнай тэрміналогіяй музычнага мастацтва. Спрадвечна беларускія музычныя тэрміны на фоне запазычанняў нешматлікія, але менавіта яны вызначаюцца найбольш шырокімі дэрывацыйнымі магчымасцямі.

Літаратура

1. Антаневіч, В.А. Слоўнік музычных тэрмінаў // В.А.Антаневіч. – Мн.: Беларусь, 1994. – 136 с.

2. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Л.А.Антанюк. – Мн.: Навука і тэхніка, 1987. – 240 с.

3. Подберезский, Д.А. Запретная музыка с 30-х годов: Толковый словарь терминологии популярной музыки / Д.А. Подберезский, Ю.И. Будько, В.П. Касперчик. – Мн.: Обозрение, 1994. – 111 с.

4. Куляшова, Г.Р. Музычны слоўнік беларуска-рускі. Музыкальный словарь русско-белорусский / аўт.-склад.: Г.Р. Куляшова, Л.А. Антанюк. – Мн.: Беларус. навука, 1999. – 559 с.